Слуцкі А.

# З КАГОРТЫ МУЖНЫХ

**На партрэце – юнак. Свежыя шчокі на якіх не так даўно стаў прабівацца пушок, па-дзіцячаму складзеныя губы, ясны погляд вачэй, адкрыты лоб, якога не паспелі перарэзаць маршчыны. На галаве – шлём танкіста, на плячах салдацкая гімнасцёрка. Такім ён застанецца на ўсё жыццё ў памяці сваёй маці Казіміры Феліксаўны Лавянецкай, знаёмых і родных, таварышаў па зброі.**

На далёкай венгерскай зямлі абарвалася жыццё салдата, а разам з ім і мары сваімі рукамі ўпрыгожваць зямлю. На магільным узгорку баявыя сябры зрабілі надпіс "Тут пахаваны Герой Савецкага Саюза Сцяпан Аляксандравіч Лавянецкі", далі салют і пайшлі на захад дабіваць ворага.

Хто ж ён такі, гэты воін, заслужыўшы вышэйшую адзнаку воінскай мужснасці? Сцяпан Лавянецкі – наш зямляк. У вёсцы Філатава Паўлавіцкага сельсавета над яго калыскай маці спявала песні, расказвала казкі. Потым сям’я пераехала ў горад Волагду.

Сцёпа рос і вучыўся ў той час, калі краіна расквітала ў гады першых пяцігодак, захапляўся подзвігамі чэлюскінцаў, лётчыкаў, што пакарылі Паўночны полюс. Хлопчыка вабіла служба ў Чырвонай Арміі. Скончыўшы сямігодку, ён звярнуўся ў ваенкамат з просьбай прызваць яго на ваенную службу. Але там сказалі:

– Ранавата яшчэ. Падрасці, падвучыся!

Ды вось выбухнула вайна. З болем у сэрцы даведаўся Сцёпа, што фашысцкая навала дакацілася да яго роднай вёскі. Хацелася хутчэй на фронт, каб адпомсціць ненавісным фашыстам.

У 1942 годзе пасля заканчэння курсаў механікаў-вадзіцеляў Сцяпан Лавянецкі пападае ў дзеючую армію, на Закаўказскі фронт. Тут ён водзіць самаходна-артылерыйскую ўстаноўку. 19-гадовы юнак у першых жа баях паказаў салдацкую смеласць, вытрымку. На яго грудзях закрасаваўся першы медаль "За адвагу".

Паўночны Каўказ, Дон Украіна... Праз іх пралеглі франтавыя дарогі, што прывялі юнака ў родную Беларусь. Разбітыя пад Бабруйскам, Віцебскам, Мінскам, фашысты імкнуліся спыніць наступленне нашых войск пад Брэстам, Але нішто не магло стрымаць нашых воінаў. Уперадзе атакуючых вёў сваю баявую машыну Сцяпан Лавянецкі. Трапнымі выстраламі ён наносіў вялікі ўрон ворагу. Ды раптам машына ўспыхнула. У яе трапіў варожы снарад. Загінулі баявыя сябры Лавянецкага. Сам жа ён цудам застаўся жывым.

Пасля баёў за Брэст на грудзях юнака закрасавалася новая ўзнагарода – ордэн Айчыннай вайны II ступені. Сцяпан зноў ірвецца ў бой. Ён атрымлівае новую машыну і б'е ворага на тэрыторыі Польшчы.

Пад Варшавай самаходна-артылерыйская ўстаноўка Лавянецкага зноў была разбіта. Шчасце зноў спадарожнічала юнаку.

З Польшчы ваенны лёс закінуў Лавянецкага ў Венгрыю. У канцы кастрычніка 1944 года разгарэліся ўпартыя баі каля горада Н'ірэдзьхаза. Сержант Лавянецкі ўдзельнічае ў іх механікам-вадзіцелем 1815-га самаходна-артылерыйскага палка 4-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса.

Нямецкае камандаванне сабрала моцны танкавы кулак. 24 кастрычніка ў раёне мястэчка Надзь-Байом Лавянецкі праявіў выключную стойкасць высокае майстэрства і гераізм. Манеўруючы сваёй машынай, ён падбіў некалькі варожых танкаў, але яго не мінуў асколак варожага снарада.

Цяжка паранены юнак працягвае весці бой. Фашыстам удалося падбіць і падпаліць самаходна-артылерыйскую ўстаноўку. У машыне вочы засцілаў едкі дым, цела лізаў агонь, вось-вось маглі ўзарвацца снарады. Але вылезці з машыны – гэта значыць папасці ў палон да фашыстаў. Юны воін палічыў за лепшае загінуць, чым стаць на калені перад ворагам...

"Ён загінуў, але яго баявыя справы, яго вобраз воіна-героя жыве і будзе жыць у сэрцах нашых воінаў і нашага народа", – пісаў камандзір часці маці Сцяпана Лавянецкага Казіміры Феліксаўне.

За стойкасць і гераізм, праяўленыя ў баях з фашыстамі Сцяпану Аляксандравічу Лавянецкаму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Памяць аб героі жыве ў сэрцы яго землякоў. Вучні Філатаўскай васьмігадовай школы збіраюць матэрыялы аб Сцяпане Лавянецкім. Яны хадайнічаюць, каб іх школа насіла яго імя, імкнуцца быць дастойнымі героя-земляка.

**Слуцкі, А. З кагорты мужных / А. Слуцкі // Зара камунізма (Бялынічы). — 1966. — 22 лютага. — С. 2.**